Дзівоснае падарожжа ў свет культурных раслін

Мэта майстар-класа “Фарміраванне прафесіянала новага тыпу праз выкарыстанне вучэбна-метадычнага комплексу “Аграпілігрым” у сістэме біялагічнай адукацыі” — стварыць умовы для прафесійнага самаўдасканалення педагога праз актывізацыю выкарыстання рэсурсаў вучэбна-метадычнага комплексу “Аграпілігрым” у сваёй дзейнасці, прадэманстраваць інструментальныя магчымасці сайта “Аграпілігрым” для прымянення ў практычнай дзейнасці педагога.

Задачы:

— павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў у сферы выкарыстання сайта “Аграпілігрым” у адукацыйным працэсе;

— знаёмства з тэарэтычнымі аспектамі вучэбна-метадычнага комплексу і сайта “Аграпілігрым”;

— агляд магчымасцей сайта “Аграпілігрым” для арганізацыі ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці навучэнцаў па біялогіі;

— атрыманне уяўлення аб магчымасцях прымянення ВМК і сайта “Аграпілігрым” для вырашэння адукацыйных задач;

— навучанне распрацоўцы адукацыйнага прадукту на аснове сайта “Аграпілігрым”.

План:

1. Прэзентацыя педагагічнага вопыту. Агляд магчымасцей прымянення вучэбна-метадычнага комплексу “Аграпілігрым” як умова крэатыўнай педагогікі ва ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці настаўніка біялогіі.

2. Практычная частка. Распрацоўка ўрокаў біялогіі па тэме “Разнастайнасць пакрытанасенных раслін” на аснове сайта “Аграпілігрым”.

3. Рэфлексія. Абмеркаванне вынікаў работы праведзенага майстар-класа.

I. Арганізацыйны момант

— Добры дзень, паважаныя калегі! Паглядзіце, калі ласка, на экран і адкажыце, з чым асацыіруецца ў вас тэрмін “аграпілігрым”. Для мяне, бо я настаўніца біялогіі, — з дзівосным падарожжам у свет культурных раслін. Сёння дзеці цудоўна арыентуюцца ў свеце інфармацыйных тэхналогій, але з цяжкасцю ўяўляюць тэхналогію вырошчвання агародніны і дэкаратыўных раслін. Ліквідаваць гэты недахоп магчыма, прадставіўшы вырошчванне раслін крэатыўна, ярка, даступна. На працягу ўжо некалькіх гадоў у гімназіі № 1 Дзятлава дзейнічае аб’яднанне “Аграпілігрым”. Асноўная мэта яго работы — спрыяць фарміраванню ў навучэнцаў ведаў пра культурныя і дзікарослыя віды раслін, іх уласцівасці і прымяненне ў сельскай гаспадарцы і медыцыне. За гэты перыяд распрацаваны і апрабаваны значны дыдактычны матэрыял да заняткаў. З мэтай сістэматызацыі матэрыялу створаны вучэбна-метадычны дапаможнік “Вучэбна-метадычны комплекс “Аграпілігрым”. ВМК “Аграпілігрым” адзначаны дыпломам II ступені на рэспубліканскім этапе IX выставы-конкурсу вучэбна-метадычных матэрыялаў “Выкарыстанне тэхналогій развіцця экалагічнай культуры як рэсурсу фарміравання прафесійных інтарэсаў навучэнцаў”.

Вучэбна-метадычны комплекс “Аграпілігрым” уключае ў сябе: 1) дапаможнік для настаўніка; 2) сайт “Аграпілігрым” *(sites.google.com/site/agropiligrimymk).* Сайт знаходзіцца ў свабодным доступе, таму пры жаданні любы настаўнік можа яго выкарыстоўваць як для пазакласнай работы, так і на ўроках і факультатыўных занятках па біялогіі пры вывучэнні адпаведных тэм. Педагог можа выкарыстоўваць заданні цалкам ці, распрацоўваючы свае заняткі, прымяняць некаторыя прыёмы і метады, якія здаюцца яму найбольш выніковымі.

II. Актуалізацыя ведаў удзельнікаў майстар-класа

— Скажыце, хто з вас выкарыстоўвае ў сваёй дзейнасці разнастайныя інтэрнэт-рэсурсы? Якія? Колькі часу патрабуецца для таго, каб адабраць інтэрнэт-рэсурсы, якія адпавядаюць узросту навучэнцаў, тэме ўрока?

Абмен думкамі, удакладненне і карэкціроўка фармулёўкі праблемы майстар-класа.

III. Знаёмства з вучэбна-метадычным комплексам і сайтам “Аграпілігрым”

Вучэбна-метадычны комплекс цалкам адпавядае праграме аб’яднання “Аграпілігрым” і рэкамендуецца як для настаўніка, так і для навучэнцаў (малюнак 1).

Малюнак 1. Галоўная старонка сайта “Аграпілігрым”

Кантрольны блок (малюнак 2), які ўключае матэрыялы для бягучага і выніковага кантролю, самакантролю дасягненняў навучэнцаў, прадстаўлены ў выглядзе інтэрактыўных гульняў, прамежкавых, выніковых тэстаў па раздзелах і размешчаны на сайце.



Малюнак 2. Кантрольны блок

Раздзел “Вывучай, эксперыментуй, даследуй” (малюнак 3) змяшчае методыку правядзення доследаў па заданнях вучоных і дазваляе выкарыстоўваць сайт “Аграпілігрым” для арганізацыі работы аб’яднання на павышаным узроўні за кошт павелічэння колькасці гадзін.



Малюнак 3. Раздзел “Вывучай, эксперыментуй, даследуй”

Аўтары вучэбна-метадычнага комплексу сістэматызавалі інфармацыйны матэрыял па праграме аб’яднання па інтарэсах “Аграпілігрым”, распрацавалі свае інтэрактыўныя практыкаванні (малюнак 4).



Малюнак 4. Фрагмент інтэрактыўных практыкаванняў

Кожны раздзел сайта “Аграпілігрым” змяшчае метадычныя рэкамендацыі, а таксама распрацаваныя заняткі. Для павышэння пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў заняткі насычаны інтэрактыўнымі прыёмамі і методыкамі навучання, ролевымі гульнямі, дэманстрацыяй прэзентацый і відэафільмаў (малюнак 5).



Малюнак 5. Дэманстрацыя відэафільма

Частка раздзелаў уключае ў сябе метадычныя рэкамендацыі па правядзенні лабараторных і практычных работ, якія можна выкарыстоўваць на ўроках і факультатыўных занятках па біялогіі.

У якасці прыкладу хочацца пазнаёміць з дыдактычным матэрыялам сайта для вывучэння падраздзела “Фітагеаграфія”. Настаўнік у пачатку заняткаў прапануе навучэнцам разабраць слова “фітагеаграфія” па саставе. Задаючы навадныя пытанні, дапамагае прыйсці да выказвання, што фітагеаграфія — навука пра рассяленне раслін на Зямлі. Далей арганізоўваецца работа ў групах. Вялікае значэнне ў гэтым падраздзеле надаецца практычнай рабоце з гербарыем і кантролю ў выглядзе інтэрактыўнай гульні — лато “Фітагеаграфія”. Гульню можна выкарыстоўваць на ўроках батанікі пры вывучэнні тэмы “Разнастайнасць жывых арганізмаў”.

Раздзел “Групы культурных раслін па практычным выкарыстанні” — самы вялікі па колькасці гадзін, што падкрэслівае значнасць практычнай накіраванасці ВМК “Аграпілігрым”.

Пры вывучэнні падраздзела “Харчовыя расліны” заняткі праводзяцца ў форме гульні “Экспрэс-агародніна”, дапаўняецца відэафрагментам “Харчовыя расліны сямейства Бабовыя” і завяршаецца віртуальнай экспедыцыяй “Па слядах Рабінзона”. Гэтая гульня таксама можа быць выкарыстана ў 7 класе на ўроку па тэме “Бабовыя расліны” і на факультатыўных занятках пад назвай “Абагульняючы факультатыўны курс па біялогіі” ў 9 класе.

На занятках па тэме “Падарожжа ў свет лекавых раслін” прапануецца практычная работа па выкарыстанні лекавых раслін і інтэрактыўная гульня “Зялёная аптэка”, якая ажыўіць вывучэнне вучэбнага матэрыялу і забяспечыць самакантроль навучэнцаў. Практычная работа “Лекавыя расліны” можа быць выкарыстана на факультатыўных занятках пад назвай “Дзікая прырода Беларусі”.

Навучэнцы 6 класа маюць некаторыя веды па доглядзе кветкава-дэкаратыўных раслін, таму мэта падраздзела “Кветкава-дэкаратыўныя расліны” — пашырыць веды навучэнцаў пра хатнія расліны. Прапануецца выканаць практычную работу “Правілы догляду хатніх раслін” і прайсці інтэрактыўную гульню “Пазнай расліну”. Падраздзел сайта змяшчае інфармацыю для настаўніка (“Асноўныя прынцыпы фларыстыкі кампазіцыі”), што дазволіць навучэнцам на занятках стварыць невялікія фларыстычныя кампазіцыі.

Падраздзел “Сельская гаспадарка будучыні” змяшчае відэафрагменты “Стварэнне новых раслін з дапамогай ДНК”, “Будучыня — за трансгеннымі раслінамі”. Распрацоўка заняткаў пад назвай “Новыя культуры” прапануе вырашыць наступную праблему: трансгенныя расліны — карысць ці шкода? Інтэрактыўная гульня “Генная інжынерыя” замацоўвае атрыманыя веды.

Удзельнікі майстар-класа выконваюць гатовыя заданні, выкарыстоўваючы сайт “Аграпілігрым”.

IV. Мадэляванне

Матэрыял сайта “Аграпілігрым” з поспехам можа прымяняцца на ўроках біялогіі. У якасці прыкладу выкарыстоўваем раздзел “Разнастайнасць пакрытанасенных раслін” у 7 класе.

Асноўныя этапы: 1. Увайсці на *sites.google.com/site/agropiligrimymk.* 2. Прапануем педагогам, удзельнікам майстар-класа падзяліцца на групы і, выкарыстоўваючы інструментарый сайта, распрацаваць фрагменты ўрока. 3. Групы адвольна выбіраюць этапы ўрока і адпаведны матэрыял сайта. Этапы ўрока: арыенціровачна-матывацыйны, аперацыйна-пазнавальны, кантрольна-карэкцыйны, рэфлексіўны. 4. Групы афішуюць вынікі сваёй дзейнасці, дапаўняюць і карэкціруюць адна адну.

V. Рэфлексія, абмеркаванне вынікаў работы

— Падводзячы вынікі нашай работы, скажыце, калі ласка:

- Якія магчымасці прымянення сайта вам спадабаліся?

- У чым вы бачыце перавагі гэтага прадукту?

- Ці з’явіліся ў вас ідэі па выкарыстанні сайта ў працэсе выкладання свайго прадмета?

Я лічу, што выкарыстанне гэтага прадукту дазваляе стварыць аптымальныя ўмовы для павышэння эфектыўнасці выкладання праз станоўчую матывацыю, развіццё пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў, павышэнне ўзроўню выкарыстання нагляднасці на ўроку і пазаўрочнай дзейнасці, магчымасці арганізацыі праектнай дзейнасці навучэнцаў, стварэнне ўмоў для атрымання вучэбнай інфармацыі з розных крыніц, якаснае змяненне ўзаемаадносін паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу.

Будзем спадзявацца, што выкарыстанне вучэбна-метадычнага комплексу і сайта “Аграпілігрым” актывізуе пазнавальную дзейнасць навучэнцаў і нацэліць іх на выбар вывучэння прадметаў біялагічнага профілю і аграрных прафесій. Запрашаем педагогаў для сумеснай работы над удасканаленнем сайта.

Валянціна БАГДАНОВІЧ,
настаўніца біялогіі гімназіі № 1 Дзятлава.